ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка
г. Жодзіна»

# Каляндар
# знамянальных і памятных дат
# г. Жодзіна
# на 2024 год

## 80 гадоў з
## вызвалення горада
## Жодзіна



# Каляндар знамянальных і памятных дат г.Жодзіна на 2024 г.

- **160** год назад у Жодзіне адкрылася народнае вучылішча. (1864)
- **100** год назад Жодзіна стаў цэнтрам сельсавета Смалявіцкага р-на (Жодзінскі сельсавет). (1924)
- **95** год назад адкрыўся ўрачэбны ўчастак (амбулаторыя) па вуліцы Камсамольскай. Загадваў амбулаторыяй фельчар Сіліч Ю.М. (1929)
- **85** год назад адчынілася школа фабрычнага навучання. (1939)
- **60** год таму закладзены парк-дэндрарый “навуковага гарадка”. (1964)
- **60** год таму ў горадзе з’явілася першая аўтаматызаваная тэлефонная станцыя. (1964)
- **35** год таму зарэгістравана першая праваслаўная абшчына св. Архангела Міхаіла. (1989)

## *Студзень*

### *1студзеня*

- **85** год з дня нараджэння **Шчарбовіч** Людмілы Станіславаўны (1.01.1939, г. Мінск). З 1963г. жыве ў г.Жодзіна, дзе працавала настаўніцай пачатковых класаў у СШ №3, №4, №5. У 1982 г. ёй нададзена званне “Заслужаны настаўнік БССР”.
- **65** год з дня нараджэння **Андруковіча** Мікалая Мікалаевіча (1.01.1959, г.Жодзіна), беларускі мастак, працуе ў станкавым жывапісе (пейзаж, нацюрморт). Член Беларускага Саюза мастакоў з 1990 г.

*10 студзеня*

- **85** год з дня нараджэння **Нікітчанка** Івана Мікалаевіча (10.01.1939, в.Горыцы Пагарскага р-на Бранскай вобл., Расія – 20.11.2011), беларускі вучоны ў галіне генетыкі і селекцыі сельскагаспадарчых жывёл. Чл.-кар. АН Беларусі (1986), доктар сельскагаспадарчых навук (1979), прафесар (1981). З 1986г. у НПЦ НАН па жывёлагадоўлі, з 1971г. – загадчык сектара, з 1974г. – намеснік дырэктара, з 1986г. – намеснік старшыні Дзяржаграпрама Беларусі, з 1988г. – старшыня Зах. аддзялення УАСГНІЛ, у 1991 – 1993гг. віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных даследванняў.

*15 студзеня*

- **35** год назад было арганізавана навукова-вытворчае камерцыйнае аб'яднанне “Осмій”. (1989)

*16 студзеня*

- **60** год з дня нараджэння **Дзябела** Аляксандра Яўгенавіча (16.01.1964 пас. Чырвоны Мір, Прыуральскага р-на, Уральскай вобласці, РСФСР-18.12.1982) воін- інтэрнацыяліст, загінуўшы ў Афганістане ў1982 годзе.

*25 студзеня*

- **70** год з дня нараджэння **Астапковіча** Мікалая Іванавіча (25.01.1954, г.Жодзіна – 27.12.1999), беларускі спартсмен і трэнер (веславанне на байдарках і каноэ). Заслужаны майстар спорту СССР (1975). Чэмпіён свету 1975г. (байдарка-двойка, 500м), 1981г. (байдарка-двойка, 10000м), 1983г. (байдарка-чацвёрка, 10000 м.)

## *Люты*

### *8 лютага*

- **120** год з дня нараджэння **Лапо** Аркадзя Іванавіча (8.02.1904, в. Жданаўка Гарадоцкага пав. Віцебскай губ. – 5.01.1983), беларускі вучоны ў галіне селекцыі і раслінаводства. Акадэмік АН БССР (1950, чл.-кар. 1940). У НПЦ НАН па земляробству працаваў з 1960 па 1972 г.

### *13 лютага*

- **45** год таму загадам Міністэрства энэргетыкі СССР № 51[а] створан завод «Энэргаканструкцыя». (1979)

### *16 лютага*

- **100** год з дня нараджэння **Заспіцкага** Андрэя Міхайлавіча (16.02.1924, г.Мазовец, Польшча – 9.03.2019) беларускі скульптар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, адзін са стваральнікаў манумента ў гонар маці-патрыёткі ў г. Жодзіна.

## *Сакавік*

### *3 сакавіка*

- **110** год з дня нараджэння **Сямашкі** Івана Сцяпанавіча (03.03.1914, в. Судабоўка, Смалявіцкага р-на - 1998) падпалкоўнік, удзельнік фінскай вайны 1939-1940 гг., пад час Вялікай  Айчыннай вайны ваяваў на Паўднёва-Заходнім, Калінінскім, 2-ім Украінскім, 3-ім Беларускім, 1-ым Прыбалтыйскім франтах. Узнагароды: два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэн Чырвонага Сцяга, ордэны Айчыннай вайны 1 и 2 ступені, медалі.

***23 сакавіка***

- **85** год з дня нараджэння **Казюка** Анатоля Паўлавіча (23.03.1939, в. Арэшкавічы, Бярэзінскі р-н, Мінскай вобл.) журналіст, паэт. Працаваў на БелАзе токарам, зборшчыкам, наладчыкам, канструктарам, журналістам і рэдактарам газеты «Беларуский автозаводец», начальнікам тыпаграфіі БелАза. Аўтар зборнікаў вершаў «Зорныя плёсы», «Зямныя зарніцы», «Ніва жыцця».

***Красавік***

- **25** год таму прайшоў першы гарадскі фестываль харавой музыкі «Ад Шчырага сэрца». (1999)

***2 красавіка***

- **50** год назад утварыўся дзіцяча-юнацкі клуб "Гагарынец" пры ЖКА БелАЗа. У снежні 1984г. клуб пераехаў у новы будынак па вуліцы Гагарына. Загадчыцай клуба была Варашкова Л. Я. (1974)
- **40** год назад адчыніўся дзіцячы сад №18 "Сказка". Першая загадчыца – Буцько Р.І. (1984)

***15 красавіка***

- **65** год назад выйшаў у свет першы нумар завадской газеты "Белорусский автозаводец". Першым рэдактарам "Белорусского автозаводца" была Геніч Г. Д. (1959)

***19 красавіка***

**110** год з дня нараджэння **Гайко** Андрэя Андрэевіча (19.04.1914, г. Мінск – 6.09.1985), беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Доктар сельскагаспадарчых навук (1971), прафесар (1972). З 1952г. у НПЦ НАН па жывёлагадоўлі, а з 1973 па 1980 г. выконваў абавязкі дырэктара інстытута. На будынку НПЦ НАН па жывёлагадоўлі яму адкрыта мемарыяльная дошка.

***Май***

***6 мая***

- **50** год таму арганізаваны селекцыйны цэнтр БелНДІЖ.(1974)

***Чэрвень***

- **25** год назад створана Жодзінская гарадская арганізацыя Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання Беларускі Саюз афіцэраў. (1999)

***1 чэрвеня***

- **25** год назад пачаў функцыянаваць Жодзінскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. (1999)

***22 чэрвеня***

- **25** год назад рашэннем гарадскога Савета дэпутатаў №15 зацверджаны гімн горада Жодзіна, словы і музыка Ждановіча С.Э. (1999)

- **105** год з дня нараджэння **Сіняўскага** Івана Іванавіча (22.06.1919, в.Жажэлка Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. – 15.09.2001), беларускі пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў (1959). У 1947г. выйшаў першы зборнік апавяданняў "У навальніцу". Потым былі "Новая школа", "Піянерскі гальштук", кнігі "Ой, рэчанька, рэчанька…", "Дабрадзейка", "На правым флангу", "Марка", "Вернасць", раман "Дарога на Замлынне", зборнікі "Ахвяры кахання", "Ці будзе вяселле?" і інш. Апошні раман пісьменніка "Вярыгі" выйшаў у 2000 годзе.

*23 чэрвеня*

- **85** год з дня нараджэння **Элімелах** Міхаіла Зэлінавіча (23.06.1939, г.Гомель), старшы трэнер Жодзінскай спецыялізаванай ДзЮСШ алімпійскага рэзерву (з 1965г.). У 1973г. Элімелаху М.З. прысвоена ганаровае званне “Заслужаны трэнер Беларускай ССР”, у 1979г. – “Заслужаны трэнер СССР”.
- **65** год з дня нараджэння **Тайнікава** Уладзіміра Іванавіча (23.06.1959, в. Худава Крупскага р-на Мінскай вобл.), беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ), выхаванец Жодзінскай ДзЮСШАР. Заслужаны майстар спорту СССР (1978). Чэмпіён свету 1978г. (байдарка-двойка, 1000 м).

***Ліпень***

***2 ліпеня***

- 80 год таму Жодзіна было вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў часткамі 352-ой і 220-ай стралковых дывізій разам з 3-ім танкавым корпусам 5-ай гвардзейскай танкавай арміі 3-га Беларускага фронта. (1944)

***17 ліпеня***

- 100 год назад быў створан Смалявіцкі раён у складзе Барысаўскай акругі. (1924)

***Жнівень***

***6 жніўня***

- **80** год з дня нараджэння **Грыба** Станіслава Іванавіча (6.08.1944, в.Савічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), беларускі вучоны-селекцыянер, доктар сельскагаспадарчых навук (1988), акадэмік Акадэміі

аграрных навук Рэспублікі Беларусь (1994), прафесар (1996). З 1978г. намеснік дырэктара НПЦ НАН па земляробству, кіраўнік селекцыйнага цэнтра, з 1995г. віцэ-прэзідэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь.

***14 жніўня***

- **45** год назад ў г.Жодзіна сфарміравана вайсковая частка 83553. Камандзірам быў маёр Маркаў Г.Н. (1979)

***20 жніўня***

- **65** год назад у Жодзіне адчынілася спартыўная дзіцячая юнацкая школа, якая ў 1965г. стала школай па веславанню на байдарках і каноэ. (1959)

***24 жніўня***

- **90** год з дня нараджэння **Грынь** Міхаіла Паўлавіча (24.08.1934, в.Малыя Вераб'евічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, доктар сельскагаспадарчых навук (1987), прафесар (1988). З 1957г. у НПЦ НАН па жывёлагадоўлі (у 1965 – 1968 – вучоны сакратар).

***Верасень***

- **55** год таму адкрыўся стадыён "Тарпеда". (1969)

***1 верасня***

- **65** год назад на базе музычнай студыі пры СШ №1 створана музычная школа. Першы дырэктар – Чалоўскі В.І. (1959)

- **45** год назад пачала працаваць СШ №6. Першы дырэктар школы – Елісееў П. П. (1979)

- **35** год назад пачала працаваць СШ №8. Першы дырэктар – Каваленка У.Ф. (1989)

- **35** год назад адкрылася гарадская дзіцячая мастацкая школа. Першы дырэктар – Сабалеўскі А.М. (1989)

***3 верасня***

- **50** год назад ў г. Жодзіна быў створаны аддзел адукацыі (1974). Першая загадчыца – Матусевіч Л.М.

***13 верасня***

- **115** год з дня нараджэння **Пракопава** Пятра Яфімавіча (13.9.1909, в. Старая Мілееўка Магілёўскага р-на – 24.6.1980), беларускі вучоны ў галіне агульнага земляробства і раслінаводства. Чл.-кар. АН Беларусі (1950), доктар сельскагаспадарчых навук (1960), прафесар (1963). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1988). З 1969 г. загадчык аддзела ў НПЦ НАН па земляробству.

***19 верасня***

- **45** год назад было створана будаўнічае ўпраўленне №216 у складзе будаўніча-мантажнаму трэсту №29, БУ было даручана будаўніцтва КЗЦШ (1979). Першы кіраўнік упраўлення – Салавей Я.Ф.

***Кастрычнік***

***1 кастрычніка***

- **85** год з дня нараджэння **Антанюк** Віталія Сцяпанавіча (10.10.1939, г.Крамянчуг, Украіна – 06.05.2002), беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Доктар біялагічных навук (1985), прафесар (1989). У 1974 – 1987гг. узначальваў НПЦ НАН па жывёлагадоўлі. З 1987г. - у Беларускім інстытуце механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, з 1991г. – старшыня Беларускага аддзялення УАСГНІЛ, адначасова намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. З 1992г. – прэзідэнт Акадэміі аграрных навук Беларусі.

- **65** год таму ў Жодзіна пры Беларускім аўтазаводзе адкрыўся філіял Мінскага аўтамеханічнага тэхнікума, з 1973 г. Жодзінскі палітэхнікум. (1959)

***16 кастрычніка***

- **95** год з дня нараджэння **Шпакоўскага** Тома Аляксандравіча (16.10.1929, в. Шулякі, Слуцкага р-на, Мінскай вобл. - 1998), дырэктар Беларускага аўтазавода з 1976 па 1979 гг. Узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

***21 кастрычніка***

- **60** год назад адчынілася СШ №4. Першы дырэктар – Глейзераў А. З. (1964)

***Лістапад***

- **95** год назад быў створаны калгас “Чырвонае Жодзіна”. Старшынёй выбралі Булаўскага М.Я. (1929).

- **45** год назад адчыніўся дзіцячы сад №15 “Огонёк”. Першая загадчыца – Гарбацэвіч Г.І. (1979)

- **45** год назад адчыніўся дзіцячы сад №16 “Светлячок”. Першая загадчыца – Шымановіч В.А. (1979)

- **35** год назад створаны фальклорны калектыў ААТ “Світанак” ансамбль народнай песні “Белая Русь”. Першы кіраўнік – Смарговіч С. (1989)

***2 лістапада***

- **80** год таму гераічна загінуў **Пётр Іванавіч Купрыянаў**, закрыўшы сваім целам амбразуру варожага дзота на тэрыторыі Латвіі. 25.03.1945 Пятру Купрыянаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. (1944)

***15 лістапада***

- **70** год з дня нараджэння **Гладкевіча** Уладзіміра Васільевіча (15.11.1954, г.Жодзіна), беларускі мастак (графік, жывапісец). Член Беларускага Саюза мастакоў з 1993г.

***Снежань***

***2 снежня***

- **75** год таму ўтварылася Жодзінская аб'яднаная сельская бальніца. Першым галоўным урачом быў назначаны Сіліч М.Ю. (1949)

***17 снежня***

- **90** год з дня нараджэння **Доўгага** Барыса Аляксандравіча (17.12.1934, г. Віцебск – 02.01.02) старшыня выканаўчага камітэта г. Жодзіна з 1968 па 1985г.

***19 снежня***

- **50** год з дня нраджэння **Ждановіча** Сяргея Эдуардавіча (19.12.1974-, г.Балакова, Саратаўская вобл., РСФСР) музыкант і кампазітар, аўтар словаў і музыкі гімна г. Жодзіна.

# Імянны паказальнік


| | |
|---|---|
| Андруковіч М.М. | **1** |
| Антанюк В.С. | **8** |
| Астапковіч М.І. | **2** |
| Булаўскі М.Я. | 9 |
| Буцько Р.І. | 4 |
| Варашкова Л.Я | 4 |
| Гайко А.А. | **4** |
| Гарбацэвіч Г.І. | 9 |
| Геніч Г.Д. | 4 |
| Гладкевіч У.В. | **9** |
| Глейзераў А.З. | 9 |
| Грыб С.І. | 7 |
| Грынь М.П. | 7 |
| Дзябела А.Я. | **2** |
| Доўгі Б.А. | **10** |
| Елісееў П.П. | 7 |
| Ждановіч С.Э. | 5, **10** |
| ЗаспіцкіА.М | **3** |
| Каваленка У. Ф. | 7 |
| Казюка А.П. | **4** |
| Купрыянаў П.І. | **9** |
| Лапо А.І. | **3** |
| Ляшчэня А.І. | **10** |
| Маркаў Г.Н. | 7 |
| Матусевіч Л.М. | 8 |
| Менткоўская Я.Б. | 5 |
| Нікітчынка І.М. | **2** |
| Пракопаў П.Я. | **8** |
| Сабалеўскі А.М. | 8 |
| Салавей Я.Ф. | 8 |
| Сіліч М.Ю. | 10 |
| Сіняўскі І.І. | **5** |
| Смарговіч С. | 9 |
| Сушкевіч П.А. | 4 |
| Сямашка І.С. | **3** |
| Тайнікаў У.І. | **6** |
| Чалоўскі В.І. | 7 |
| Шпакоускі Т.А. | **9** |
| Шчарбовіч Л.С. | **1** |
| Шымановіч В.А. | 9 |
| Элімелах М.З. | **6** |

Каляндар знамянальных і памятных дат г.Жодзіна на 2024 г.

Складальнік: Копцік С.К.

Рэдактар: Менцюк Н.У.

Камп'ютэрная верстка: Копцік С.К.

Дызайн вокладкі: Кітабава В.Р.

Адказны за выпуск: Копцік С.К.

Падпісаны да друку: 08.11.2023

Тыраж: 5

Заказ №16

Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна.
222160, г. Жодзіна, пр. Міру, 21
тэл. 6-52-26
E-mail: libzhodino@gmail.com

E-mail: libzhodino@gmail.com

Тел.: 6-62-63

6-45-90

пр. Міру, 21

Рэжым працы:

Панядзелак - чацвер з 10.00 да 19.00

Субота, нядзеля з 10.00 да 18.00

Пятніца - выхадны.

Апошняя серада месяца - сан. дзень.